

# Прытча

**Аднойчы аднаго мудрага і разумнага чалавека спыталі у чым сакрэт яго мудрасці. Ён задумаўся а затым адказаў: Калі людзі шукаюць іголку ў стозе сена, то большасць спыняецца, як толькі знойдзе яе. А я працягваю пошукі, знаходзячы другую трэцюю чацвёртую…**

***- Якая асноўная думка тэксту?***

У прапанаваным тэксце прытчы расстаўце неабходныя знакі прыпынку, вызначце будову сказаў

**Аднойчы аднаго мудрага і разумнага чалавека спыталі у чым сакрэт яго мудрасці. Ён задумаўся а затым адказаў: Калі людзі шукаюць іголку ў стозе сена, то большасць спыняецца, як толькі знойдзе яе. А я працягваю пошукі, знаходзячы другую трэцюю чацвёртую…**

**Аднойчы аднаго мудрага і разумнага чалавека спыталі, у чым сакрэт яго мудрасці. Ён задумаўся, а затым адказаў: “Калі людзі шукаюць іголку ў стозе сена, то большасць спыняецца, як толькі знойдзе яе. А я працягваю пошукі, знаходзячы другую, трэцюю, чацвёртую…”**

- **Чаму пасля двукроп’я слова “калі” пішацца з вялікай літары?**

# Простая мова. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай

- Пазнаёмцеся з планам вывучэння тэмы і паспрабуйце вызначыць мэты.

**План**

1. Паняцце “простая мова”. Будова сказаў з простай мовай.
2. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай.
3. Інтанацыйнае афармленне сказаў з простай мовай.

# Запішыце, што вы ведаеце і што хочаце даведацца аб простай мове

| Ведаю | Хачу даведацца | Даведаўся |
| --- | --- | --- |
| | | |

# Вызначце будову сказа.

**Ён задумаўся, а затым адказаў: “Калі людзі шукаюць іголку ў стозе сена, то большасць спыняецца, як толькі знойдзе яе. А я працягваю пошукі, знаходзячы другую, трэцюю, чацвёртую…”**

# Праца з лінгвістычным матэрыялам вучэбнага дапаможніка (с. 102-105).

- Якія выпадкі пастаноўкі знакаў прыпынку з простай мовай вы можаце назваць яшчэ?
- У чым асаблівасць інтанацыйнага афармлення сказаў?

# Выкананне задання па варыянтах

**I варыянт**

**1.** *Адзначце сказ, у якім правільна расстаўлены знакі прыпынку.*

1) **У вершы «Роднае слова» Якуб Колас выказаў пачуццё гонару за родную мову: «Магутнае слова, ты, роднае слова! Са мной ты на яве і ў сне».**

**2) Жыццё пражыць — не поле перайсці гаворыць народная мудрасць.**

2. *Правільна расстаўце знакі прыпынку ў сказах з простай мовай.*

**1) Гэтыя людзі шчаслівыя, таму што ўмеюць усміхацца, — сказаў настаўнік.**

**2)Адкуль у цябе столькі гонару спытаў Іван, глянуўшы на брата.**

3. *Перабудуйце складаны сказ у сказ з простай мовай.*

**Званы Хатыні, мемарыял у Брэсцкай крэпасці-героі нагадваюць жывым людзям, каб яны помнілі і не дапускалі новай бойні**.

**II варыянт**

**1.** *Адзначце сказ, у якім правільна расстаўлены знакі прыпынку.*

1) **«Шануйце і любіце сваю родную мову» з такімі словамі звяртаўся да вас дзеці народны пісьменнік Беларусі Якуб Колас.**

**2) Пятрусь Броўка пісаў: «Багата, родная ты мова».**

2. *Правільна расстаўце знакі прыпынку ў сказах з простай мовай.*

1)**Якуб Колас гаварыў роднае слова першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы нас свет.**

**2)Куды ты сабраўся ў такую рань запытала маці.**

3. *Перабудуйце складаны сказ у сказ з простай мовай*.

**Неаднаразова бацька гаварыў сыну, што меркаваць аб чалавеку трэба па яго справах.**

# Узаемаправерка па ключы, ацэньванне.
# Адказы

***1варыянт:***

1 — 1.

2\. 1) «Гэтыя людзі шчаслівыя, таму што ўмеюць усміхацца», — сказаў настаўнік.
2) «Адкуль у цябе столькі гонару?» — спытаў Іван, глянуўшы на брата.

3\. Званы Хатыні, мемарыял у Брэсцкай крэпасці-героі нагадваюць жывым людзям:
«Людзі! Помніце! Не дапускайце новай бойні!»

***2 варыянт:***

1 — 2.

2\. 1) Якуб Колас гаварыў: «Роднае слова — першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы нас свет».
2) «Куды ты сабраўся ў такую рань?» — запытала маці.

3\. Неаднаразова бацька гаварыў сыну: «Меркаваць аб чалавеку трэба па яго справах».

# Фізкультхвілінка



# Запоўніце кластар

**Знакі прыпынку**
**ў сказах з**
**простай мовай**

# Запішыце, што даведаліся аб простай мове

| Ведаю | Хачу даведацца | Даведаўся |
| --- | --- | --- |
| | | |

# Тэставае заданне (-) (+)

1. Простая мова — гэта словы пэўнай асобы, якія перадаюцца ў зmененай форме.
2. Простая мова — гэта чыё-небудзь выказванне, перададзенае без змен.
3. Пры простай мове ўжываіоцца словы аўтара. Яны паказваюць, каму належыць выказванне.
4. Простая мова бярэцца ў двукоссе, першае слова яе пішацца з малой літары.

5. Пасля слоў аўтара перад простай мовай ставіцца працяжнік.
6. Пасля простай мовы перад словамі аўтара ў залежнасці ад інтанацыі ставіцца коска, пытальнік або клічнік і працяжнік. Словы аўтара пішуцца з малой літары.
7. У дадзеным сказе простая мова бярэцца ў двукоссе, першае слова яе пішацца з вялікай літары.

«Пісьменнік вялікай душы», — кажуць пра Кузьму Чорнага людзі, якія добра ведаюць яго творы.

8. У дадзеным сказе пасля слоў аўтара перад простай мовай ставіцца працяжнік.

Міхась Лынькоў адзначаў — «Творчасць Якуба Коласа — гэта своеасаблівы летапіс жыцця народа».

9. Схема дадзенага сказа пабудавана няправільна.

«Як, няўжо няма ні аднаго блізкага мне чалавека,ні адной душы?» — пытаў і пытаў у сябе Іван.

**«П?» — а.**

10. Схема дадзенага сказа пабудавана правільна.

Барыс Сачанка справядліва адзначаў: «Мова —не толькі сродак зносін, а і душа народа, яго культура».

**«А», — п.**

# Адказы:

- 1 (-),
- 2 (+),
- 3 (+),
- 4 (-),
- 5 (-),
- 6 (+),
  7 (+),
- 8 (-),
- 9 (-),
- 10 (-).

# Прыём “Ацэначнае акно”

Добра зразумеў…

Зусім не зразумеў…

Магу прымяняць…

Не змагу прымяняць…

# Дамашняе заданне

- Параграф 23, практ. 179

**У мудраца спыталі:**

**- У чым сакрэт вашай мудрасці?**

**- Калі шукаюць іголку ў стозе сена, то большасць спыняецца, як толькі знойдзе яе. А я працягваю пошукі. Знаходзячы другую, трэцяю, чацвёртую…**

- *Чым адрозніваюцца тэксты прытчы?*
- *Чаму шматкроп'е ў канцы сказа?*